*Да Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту*

# АГІТРЭЙС СТУДЭНТАЎ

Дзевяць дзён запар радавала гледачоў сваімі выступленнямі агітбрыгада універсітэта, якая знаходзілася ў агітрэйсе, прысвечаным 69-й гадавіне Узброеных Сіл СССР і 60-годдзю ДТСААФ. Свае выступленні яна пачала ў вёсцы Азершчына Рэчыцкага раёна перад навучэнцамі прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча. Затым самадзейныя артысты былі жаданымі гасцямі жыхароў вёсак Левашы, Артукі, Пракісель.

Цёпла сустракалі нашых студэнтаў і на Мазыршчыне. Яны выступілі перад калектывамі Мазырскай МПМК-105, працаўнікамі калгаса імя Леніна, саўгаса «Асавец», жыхарамі вёскі Савічы.

У маршруце агітрыгады быў і Петрыкаўскі раён. Яна выступіла ў Дамах культуры саўгасаў «Навасёлкі», «Запаветы Ільіча», калгасаў «Шлях да камунізму», «40 гадоў Кастрычніка».

Кіраўніком агітбрыгады з'яўляўся намеснік дэкана па спорту эканамічнага факультэта П. П. Саковіч. Ён жа выступаў з лекцыямі.

У праграму канцэртаў уваходзілі кампазіцыя «Аб'явім п'янству бой» і нумары мастацкай самадзейнасці на ваенна-патрыятычную тэматыку.

Каля трох тысяч працаўнікоў і моладзі трох раёнаў Гомельшчыны праслухалі лекцыі і прагледзелі канцэртную праграму агітбрыгады ГДУ. Шмат апладысментаў выпала на долю яе найбольш актыўных удзельнікаў Таццяны Рыбаковай з факультэта фізічнага выхавання, Таццяны Парэмскай з фізічнага, Валерыя Ігнатава і Мікалая Васюка з эканамічнага, Святланы Касаевай і Ларысы Міхаленка з матэматычнага факультэтаў, іншых самадзейных артыстаў.

(Наш кар.).

*Аб сябрах-аднапалчанах*

# ВЕРНЫ АБАВЯЗКУ

Амаль кожны дзень я сустракаюся з чалавекам, у паходцы і постаці якога заўважаецца ваенная выпраўка. Гэта Віктар Васільевіч Юфераў — падпалкоўнік у адстаўцы, мой добры даўні сябра і былы аднапалчанін.

Цікавая біяграфія ў Віктара Васільевіча. Вайсковую форму ён не здымаў на працягу дваццаці з лішнім гадоў — так ужо склаўся яго лёс. Яму, юнаку з Краснаярскага краю, не было яшчэ і семнаццаці, як выклікалі ў ваенкамат. У Чырвоную Армію камсамольца праводзілі ўсёй вёскай.

Пасля нядоўгай вайсковай падрыхтоўкі В. Юферава накіравалі ў палкавую школу. Тут ён набыў спецыяльнасць радыста. Затым вучыўся ў Хабараўскім стралкова-мінамётным вучылішчы. Тут дзевятага жніўня пераможнага 1945 года на мітынгу асабовага саставу ён даведаўся, што ўрад СССР, выконваючы абавязацельствы па Ялцінскаму пагадненню, заявіў аб уступленні ў вайну з імперыялістычнай Японіяй. Разумеючы і поўнасцю адабраючы палітыку Камуністычнай партыі, В. Юфераў, як і ўсе яго таварышы па вучылішчу і воіны-далёкаўсходнікі, быў гатовы выканаць свой воінскі абавязак.

Пасля перамогі над імперыялістычнай Японіяй вайсковая служба для Віктара Васільевіча не закончылася. Многія гады свайго жыцця ён аддаў Узброеным Сілам СССР. Быў камандзірам узвода, палітработнікам батальённага, палкавога і дывізійнага звяна. На ўсіх пасадах Віктар Васільевіч з пачуццём высокай адказнасці адносіўся да сваёй справы. Усе сілы, веды і вопыт аддаваў выхаванню савецкіх воінаў. Як адзнака добрасумленнага выканання сваіх службовых абавязкаў — узнагароды Радзімы. Ён удастоены ордэна Чырвонай Зоркі і некалькіх медалёў.

Пайшоўшы на заслужаны адпачынак, Віктар Васільевіч не змог заставацца без справы. Спачатку працаваў у гомельскіх СШ №№ 14 і 26. Камуністы гэтых школ неаднаразова выбіралі яго ў састаў бюро і сакратарам партыйных арганізацый. З 1969 года В. В. Юфераў — начальнік аддзела кадраў, загадчык вучэбнага аддзела, асістэнт кафедры навуковага камунізму Гомельскага дзяржуніверсітэта. Увесь гэты час ён вядзе вялікую грамадскую і ваенна-палітычную работу сярод студэнцкай моладзі.

У Віктара Васільевіча шмат узнагарод. Сярод іх — граматы партыйных і савецкіх органаў, ваенкамата, іншых грамадскіх арганізацый, каштоўныя падарункі.

Не так даўно Віктар Васільевіч, як кажуць, разменяў сёмы дзесятак. Але, нягледзячы на такі ўзрост, ён яшчэ поўны бадзёрасці і клопатаў. Пра яго можна сказаць: застаецца ў страі.

**Ф. СТЭЛЬМАШОК,**
**падпалкоўнік у адстаўцы.**

# КРОК НАПЕРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

цвярдзенняў — (кіраўнік дацэнт І. М. Мельнічэнка); атрымана 21 аўтарскае пасведчанне на вынаходніцтвы; выдадзены 2 кіруючыя дакументы Дзяржаграпрома СССР; выдадзены метадычныя рэкамендацыі прафесара В. А. Балакіна пад грыфам Дзяржстандарта СССР, падрыхтаваны і апублікаваны Дзяржстандарт 23.224.86; укаранёна 12 НДР з агульным эканамічным эфектам 725 тыс. руб.

Загадчыкам кафедры оптыкі дацэнтам А. М. Сердзюковым абаронена доктарская дысертацыя. З грыфам міністэрства выдадзены вучэбны дапаможнік дацэнта кафедры радыёфізікі М. І. Ефіменкі. Істотны ўклад у дасягненні факультэта ўнесла кафедра фізікі цвёрдага цела (загадчык — прафесар В. А. Балакін).

Выкладчыкамі эканамічнага факультэта апублікаваны 3 падручнікі, з якіх 2 прыходзіцца на долю загадчыка кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці прафесара В. Е. Цішчанкі. Факультэт актыўна прыцягвае да навуковых даследаванняў студэнтаў. У 1986 годзе выканаўцамі гаспдагаворных і дзяржбюджэтных работ з'яўляліся 577 студэнтаў, што больш чым ва ўсіх астатніх падраздзяленнях ГДУ разам узятых. На факультэце плённа працуюць над падрыхтоўкай кандыдацкіх дысертацый. Пры гэтым актыўна выкарыстоўваецца мэтавая аспірантура. У мінулым годзе абаронены тры дысертацыі і дзве прадстаўлены да абароны.

На гісторыка-філалагічным факультэце абаронена 5 кандыдацкіх дысертацый, з іх тры— на кафедры рускай літаратуры (Л. І. Толчыкава, А. М. Ненадавец, Т. Р. Сіманава). Загадчык кафедры У. М. Сабаленка зрабіў параўнальны аналіз буйнейшых у рускай літаратуры раманаў-эпапей «Вайна і мір» Л. Талстога і «Ціхі Дон» М. Шолахава. Па матэрыялах даследавання выдадзена манаграфія.

Геалагічны факультэт мае 6 першых месц (прыбыццё выпускнікоў на месцы размеркавання, абарона кандыдацкіх дысертацый, важнейшая тэматыка НДР, колькасць укаранёных НДР, лекцыі па лініі таварыства «Веды», насценны друк), столькі ж першых месц і на фізічным факультэце. Але ў геолагаў — 10 нулявых або блізкіх да нулявых адзнак. Гэта больш, чым на іншых факультэтах.

Матэматычны факультэт спыніўся ў сваім развіцці. Зменшылася колькасць абароненых кандыдацкіх дысертацый, не абараняюцца доктарскія дысертацыі, знізілася эфектыўнасць НДР. Усё гэта прывяло, пры агульным росце вынікаў у іншых падраздзяленнях, да таго, што факультэт перамясціўся з першага месца ў 1985 годзе на пятае. Хочацца спадзявацца, што матэматыкі змогуць у далейшым выйсці на больш высокія рубяжы.

Факультэт фізічнага выхавання прымае актыўны ўдзел у выстаўках (міжнародных, саюзных, рэспубліканскіх), добра пастаўлена тут падрыхтоўка студэнтаў праз ФГП. Але гэтага мала. Маючы добрыя паказчыкі толькі па 3—4 пазіцыях, нельга разлічваць на высокае месца ў сацыялістычным спаборніцтве.

Біялагічны факультэт па традыцыі моцны сваёй друкаванай прадукцыяй. Ён займае першае месца ў ГДУ па выданню навуковых артыкулаў, тэзісаў дакладаў, метадычных распрацовак праз ратапрынт універсітэта. Толькі дацэнт Л. М. Сапегін апублікаваў у 1986 годзе 14 навуковых артыкулаў.

З агульнауніверсітэцкіх кафедр трэба адзначыць стабільныя і высокія паказчыкі кафедр педагогікі і псіхалогіі і палітэканоміі, якія яны паказвалі ў мінулай пяцігодцы і летась.

Наш рэзерв — гэта абарона доктарскіх дысертацый, высокая прафесіянальная падрыхтоўка спецыялістаў, павышэнне рэальнай аддачы навуковай прадукцыі для народнай гаспадаркі. За мінулую пяцігодку ў ГДУ падрыхтаваны 3 доктарскія і 68 кандыдацкіх дысертацый, г. зн. каэфіцыент 1:23, у цэлым жа па краіне ён складае 1:9. Нам трэба больш укараняць у практыку вынаходніцтваў. За мінулую пяцігодку з 74 вынаходніцтваў укаранёны толькі 3. У мінулым годзе з 21 — 2 укаранёны ў вучэбны працэс. Нашай задачай з'яўляецца таксама павышэнне ролі сацыялістычнага спаборніцтва. Яно пакуль што зводзіцца да снежаньска-студзеньскай кампаніі па падвядзенню вынікаў і прыёму новых сацыялістычных абавязацельстваў. Неабходна ўзмацніць галоснасць спаборніцтва, садзейнічаць перадачы, распаўсюджванню перадавога вопыту.

**А. АКУЛЕВІЧ,**
**старшыня вытворча-масавай камісіі прафкома.**

*Людзі творчай думкі*

# ЗАЎЖДЫ Ў ПОШУКУ

Для чалавека творчай думкі, поўнага навуковых ідэй і задум, у няспыннай плыні гадоў кожны пражыты дзень і той, што яшчэ наперадзе, — асаблівы па-свойму. Бо ў знешняй будзённасці такі чалавек умее бачыць, адкрываць для сябе прыгажосць, мудрасць жыцця і той справы, якой самааддана служыць.

На першы погляд звычайным становіцца для кандыдата педагагічных навук, дацэнта, загадчыка кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання У. А. Баркова кожны дзень: вучэбныя заняткі са студэнтамі, неадкладныя кафедральныя, грамадскія справы... Але ўсё ж ёсць у гэтым кожным дні і свая адметнасць — ён напаўняецца творчым пошукам вынаходніка. У першым вучэбным корпусе ёсць невялікая майстэрня, у якой Уладзіслаў Аляксеевіч у вольны час займаецца сваёй любімай справай — канструяваннем і вырабам разнастайных трэнажораў для спартсменаў. У цяперашні час яны сталі вядучым напрамкам у развіцці спартыўнай тэхнікі. На рахунку У. А. Баркова такіх трэнажораў ужо нямала. Укаранёны ў вучэбны і трэніровачны працэсы ВНУ, сярэднеадукацыйных школ, ДЮСШ яго трэнажоры «Увага», для стралка з лука, якія дэманстраваліся на рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных выстаўках — у Аўстрыі, ЧССР, Польшчы, атрымалі шматлікія дыпломы і ўзнагароды. Апошняе «дзецішча» Уладзіслава Аляксеевіча — дынамічны рукаход, які можа з поспехам замяняць спартсменам у час іх трэніровак не зусім зручную ў карыстанні гарызантальную лесвіцу. Вартасці доследнага яго ўзору высока ацэнены на IV Усесаюзнай навукова-тэхнічнай канферэнцыі «Тэхніка і спорт», праведзенай Спорткамітэтам СССР, дзе ён дэманстраваўся, а таксама трэнерамі, спецыялістамі фізічнай культуры г. Гомеля. Цяпер вырашаецца пытанне аб масавым выпуску гэтага трэнажора ў цэху тавараў народнага спажывання ВА «Гомсельмаш». Шырокае ўкараненне дынамічнага рукахода ў практыку дазволіць спартсменам развіваць і ўдасканальваць сваё майстэрства.

Не згасае энергія творчай думкі ў тым выпадку, калі вынаходнік — у пастаянным пошуку. Гэты пошук пачаўся у Баркова яшчэ ў студэнцкія гады ў навукова-даследчай лабараторыі пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка факультэта фізвыхавання В. Д. Падасінава. Тады ж і прыйшлі першыя поспехі: зробленыя рукамі студэнта У. Баркова прыборы, прыстасаванні дэманстраваліся на рэспубліканскай выстаўцы навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, на ўсесаюзных выстаўках. А на сённяшні дзень Уладзіслаў Аляксеевіч мае 2 аўтарскія пасведчанні і 13 рацпрапаноў на тэхнічныя сродкі навучання і методыкі даследавання спартсменаў, апублікавана каля 40 яго навуковых работ, у ліку якіх — артыкулы, вучэбна-метадычныя рэкамендацыі для студэнтаў факультэта фізвыхавання, трэнераў, настаўнікаў фізкультуры сярэдніх школ. Ім унесены адчувальны ўклад у развіццё спартыўнай тэхнікі, а значыць, ва ўдасканальванне падрыхтоўкі спартсменаў, школьнікаў.

У. А. Баркоў паспяхова вядзе навукова-педагагічную дзейнасць, узначальвае НДРС факультэта фізвыхавання. Студэнцкія навуковыя работы, кіраўніком якіх з'яўляецца Уладзіслаў Аляксеевіч, як правіла, прызнаюцца лепшымі на ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах, а вынікі кіруемых ім дыпломных даследаванняў часта знаходзяць шырокае прымяненне ў практычнай рабоце дзіцячых юнацкіх спартыўных школ. А ў канцы мінулага года У. А. Баркоў стаў навуковым кіраўніком аспіранта У. М. Старчанкі.



Рыхтаваць дастойную маладую спартыўную змену — задача не з лёгкіх. Аднак, калі ў гэтую справу ўкладваць часцінку сваёй душы, вынік абавязкова будзе добрым. Такой жа думкі прытрымліваецца і У. А. Баркоў, які ў апошні час разам з выкладчыкамі ўзначальваемай ім кафедры прымае ўдзел у выкананні комплекснай праграмы Дзяржкамспорту СССР, састаўной часткай якой з'яўляецца распрацоўка і абгрунтаванне метадычных асноў кіравання падрыхтоўкай юных спартсменаў. У гэтым напрамку кафедрай ТАФВ вядзецца мэтанакіраваная работа на базе СШ №№ 29, 49 г. Гомеля і інш.

Творчы пошук, ініцыятыўнасць праяўляе У. А. Баркоў і ў грамадскай рабоце, у якой прымае актыўны ўдзел. Не першы год ўзначальвае ён культурна-масавую камісію прафкома універсітэта. Работа гэта клапатлівая, патрабуе нямала часу, каб, напрыклад, твары дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ свяціліся радаснымі ўсмешкамі на ранішніках каля лясной прыгажуні — ёлкі, ды і ў іх тат і мам быў святочны, прыўзняты настрой у час навагодніх вечароў. Тут і праяўляе Уладзіслаў Аляксеевіч сваю кемлівасць і знаходлівасць.

...Чалавека, які спазнае радасць ад творчага пошуку ў любой справе, якую ён выконвае, акрыляе думка, што зробленае ім, прыносіць карысць людзям.

**Т. ДУБЯК.**

**НА ЗДЫМКУ: У. А. Баркоў.**

Фота І. Чысціка.

